Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навуковай рабоце
_______________ В.Р.Языковіч
16.07 _______________ 2020

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ
**Літаратурнае краязнаўства**
спецыяльнасці перападрыхтоўкі
2-23 02 72 Культурна-адпачынкавая дзейнасць
кваліфікацыя: *арганізатар культурна-адпачынкавай дзейнасці*
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным 02.08.2016 г., рэг. № 25-13/187

Мінск, 2020

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распрацоўшчык праграмы:
*І.Б. Лапцёнак*, прафесар кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэкамендавана да зацвярджэння:

Кафедра культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Пратакол пасяджэння ад 14.01.2020 № 1

Савет Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Пратакол пасяджэння ад 16.01.2020 № 1

# УВОДЗІНЫ

Вучэбная праграма па дысцыпліне «Літаратурнае краязнаўства» складзена згодна з адукацыйным стандартам перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў па спецыяльнасці 2-23 02 72 «Культурна-адпачынкавая дзейнасць».

Актуальнасць вывучэння дадзенай дысцыпліны абумоўлена неабходнасцю атрымання слухачамі прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў па ажыццяўленню краязнаўчай дзейнасці.

**Мэта** праграмы: планаванне, арганізацыя і кіраванне працэсам вывучэння і засваення вучэбнай дысцыпліны «Літаратурнае краязнаўства».

**Задачы** праграмы:

даць слухачам веды ў галіне гісторыі і метадалогіі літаратурнага краязнаўства;

сфарміраваць уяўленне аб актуальных аспектах арганізацыі літаратурна-краязнаўчай дзейнасці;

прадставіць навукова-абгрунтаваны падыход да рэгіянальнага прынцыпу вывучэння літаратуры і літаратурнага працэсу;

сфарміваць уважлівыя адносіны да літаратурнай спадчыны, літаратурнай гісторыі роднага краю, вывучэння літаратурных мясцін і мастацкіх твораў вядомых беларускіх пісьменнікаў;

выпрацаваць навыкі па арганізацыі літаратурна-краязнаўчай дзейнасці.

**Метады** навучання: метад аналізу канкрэтнай сітуацыі; метады праблемнага навучання (часткова-пошукавы і даследчы).

**Сродкі** навучання: друкаваныя (вучэбныя выданні, зборы твораў, монавыданні твораў мастацкай літаратуры, зборнікі твораў, даведнікі, энцыклапедыі, літаратурна-крытычныя артыкулы, навуковыя выданні, карты і інш.); рукапісныя (копіі рукапісаў мастацкіх твораў, матэрыялы перапіскі і інш.); аўдыявізуальныя (слайд-прэзентацыі, відэафільмы, відэаролікі і інш.).

**Асноўныя патрабаванні да вынікаў навучання** ў рамках праграмы.

Слухачы павінны:

*ведаць*:

спецыфіку літаратурнага краязнаўства;

значэнне і ролю літаратурнага краязнаўства;

асноўны паняційны апарат літаратурнага краязнаўства;

гісторыю і сучасны стан літаратурнага краязнаўства ў Беларусі;

методыкі вядзення краязнаўчай работы;

крыніцы літаратурнага краязнаўства;

віды краязнаўчых дакументаў;

краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы, іх структуру;

знакавыя літаратурныя мясціны Беларусі, звязаныя з жыццёвым і творчым шляхам пісьменнікаў, літаратурным працэсам;

віды і формы культурна-адукацыйных мерапрыемстваў устаноў культуры па напрамку літаратурна-краязнаўчай дзейнасці;

актуальныя аспекты ўзаемадзеяння ўстаноў культуры з іншымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізацыямі і ўстановамі, якія займаюцца літаратурна-краязнаўчай работай;

*умець:*

працаваць з літаратурнымі крыніцамі, дакументамі і іншымі матэрыяламі краязнаўчага характару;

збіраць матэрыялы літаратурна-краязнаўчай тэматыкі;

складаць літаратурную карту сваёй мясцовасці;

арганізоўваць мерапрыемствы ў галіне літаратурна-краязнаўчай дзейнасці і (або) мерапрыемстваў з уключэннем літаратурна-краязнаўчага кампаненту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назва раздзела, тэмы | Колькасць гадзін | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Круглыя сталы, тэматычныя дыскусіі | Лабараторныя заняткі | Дзелавыя гульні | Трэнінгі | Канферэнцыі | Самастойная работа |
| **1** | **Агульныя пытанні гісторыі і метадалогіі літаратурнага краязнаўства** | | | | | | | | | | |
| 1.1 | Літаратурнае краязнаўства як навука | 4 | 2 | | | | | | | | 2 |
| 1.2 | Гісторыя станаўлення і развіцця літаратурнага краязнаўства | 4 | 2 | | | | | | | | 2 |
| 1.3 | Крыніцы літаратурнага краяўзнаўства | 6 | 2 | | | | | | | | 4 |
| **2** | **Актуальныя аспекты літаратурна-краязнаўчай дзейнасці** | | | | | | | | | | |
| 2.1 | Віды і формы літаратурна-краязнаўчай дзейнасці | 4 | 2 | | | | | | | | 2 |
| 2.2 | Культурна-адукацыйны патэнцыял літаратурна-краязнаўчай дзейнасці | 4 | 2 | | | | | | | | 2 |
| 2.3 | Рэгіянальнае літаратурнае краязнаўства | 8 | 2 | | 4 | | | | | | 2 |
| **Усяго:** | | **30** | **12** | | **4** | | | | | | **14** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

## Раздзел 1.
## Агульныя пытанні гісторыі і метадалогіі літаратурнага краязнаўства

### Тэма 1.1. Літаратурнае краязнаўства як навука

Краязнаўства як комплекс навуковых дысцыплін, розных па зместу і метадах даследавання, якія вядуць у сваёй сукупнасці да навуковага і ўсебаковага пазнання краю. Краязнаўства ў сістэме гуманітарных дысцыплін. Краязнаўства і арганізацыя культурнага адпачынку (вольнага часу) насельніцтва.

Віды краязнаўства: комплекснае і галіновае (гістарычнае, літаратурнае, этнаграфічнае, геаграфічнае, прыродазнаўчае).

Метады краязнаўства: харалагічны, храналагічны, генетычны, параўнальны.

Метады краязнаўчых даследаванняў: літаратурна-статыстычны, палявых даследаванняў, картаграфічнага вывучэння, візуальнага вывучэння, анкетавання і інш.

Мэты і задачы літаратурнага краязнаўства.

Метадалагічныя асновы літаратурнага краязнаўства. Прадмет яго вывучэння.

Літаратура як мастацтва слова. Адметнасць вобраза ў літаратуры.

Аб’екты літаратурнага краязнаўства: жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, звязаных з краем, літаратурны твор (у кантэксце мастацкіх адносін з пэўнай мясцовасцю), рукапісы, аўтографы, рэдакцыі твораў, фальклор, літаратурныя мясціны, мясцовы друк і інш.

Метады літаратурнага краязнаўства: культурна-гістарычны, біяграфічны, супастаўляльны, герменеўтычны, аналізу літаратурнага твора і інш.

Сувязь літаратуразнаўства з гістарычным краязнаўствам, гісторыяй і тэорыяй літаратуры, гісторыяй і культурай роднага краю. Роля паэтыкі літаратуры, храналогіі, біяграфістыкі, архівазнаўства, археаграфіі ў правядзенні аўтаразнаўчых даследаванняў.

Значэнне літаратурнага краязнаўства, яго месца ў сістэме навуковых ведаў і грамадскай практыкі. Сацыякультурныя функцыі літаратурнага краязнаўства: фарміраванне культуратворчага патэнцыялу, захаванне і перадача культурных айчынных традыцый і каштоўнасцей, патрыятычнае і маральна-эстэтычнае выхаванне насельніцтва, узнаўленне культурных сувязей паміж пакаленнямі. Сувязь нацыянальнай літаратурнай традыцыі з патрэбамі сучасных носьбітаў культуры на пэўнай тэрыторыі.

Агляд асноўнай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 1.2. Гісторыя станаўлення і развіцця літаратурнага краязнаўства

Фактары ўзнікнення і развіцця літаратурнага краязнаўства.

Вытокі краязнаўства. Погляды і дзейнасць Ф. Скарыны, М. Гусоўскага. Збіральніцкая дзейнасць беларускіх магнатаў Радзівілаў, Сапегаў, Храптовічаў, Агінскіх і інш. Працы Я. Ласіцкага, С. Рысінскага, М. Стрыйкоўскага як крыніцы ведаў па беларускаму краязнаўству.

Краязнаўства ў XIX – пач. XX ст. Дзейнасць Віленскай археалагічнай камісіі, Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства, Мінскага царкоўнага гісторыка-эканамічнага камітэта. Краязнаўчыя даследаванні З. Даленга-Хадакоўскага, Р. Падбярэскага, А. Рыпінскага, П. Шпілеўскага, А. Кіркора. Выданне зборнікаў дакументаў і матэрыялаў «Витебская старина», «Минская старина». Краязнаўчая дзейнасць Т. Нарбута, братоў Тышкевічаў. Літаратурна-краязнаўчы аспект творчасці А. Міцкевіча, Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Лучыны, Ф. Багушэвіча. Адкрыццё Віленскага музея старажытнасцей. Першыя краязнаўчыя таварыствы на тэрыторыі Беларусі. Роля газеты «Наша ніва» ў папулярызацыі краязнаўчых матэрыялаў. Роля чытанак для школы Цёткі, К. Міцкевіча (Я. Коласа), В. Ластоўскага, Я. Лёсіка ў зараджэнні школьнага краязнаўства.

Краязнаўчая праца ў 20-я гг. XX ст. Краязнаўства і палітыка беларусізацыі. Роля Інстытута беларускай культуры ў арганізацыі краязнаўчага руху. Цэнтральнае бюро краязнаўства. 1-я Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя (1924). Першы і другі Усебеларускія краязнаўчыя з’езды. Роля часопісаў «Наш край» і «Асвета». Актыўныя ўдзельнікі краязнаўчага руху: М. Доўнар-Запольскі, А. Ельскі, В. Ластоўскі, Я. Колас, З. Бядуля, М. Гарэцкі, Ц. Гартны, Б. Эпімах-Шыпіла, К. Крапіва. Роля М. Каспяровіча ў папулярызацыі літаратурна-краязнаўчых заняткаў у школе. Краязнаўчае таварыства БДУ.

Краязнаўства ў 30-я гг. XX ст. Згортванне краязнаўства, яго прычыны. Ліквідацыя краязнаўчых арганізацый. Лёс вядомых літаратуразнаўцаў.

Развіццё літаратурнага краязнаўства ў пасляваенныя гады. Прыняцце закона «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці народнай адукацыі ў СССР» (1958) і яго роля ў інтэнсіфікацыі краязнаўчай работы ва ўстановах адукацыі.

Краязнаўства на сучасным этапе. Краязнаўства ва ўстановах адукацыі. Турысцкае краязнаўства. Важнейшыя даследаванні. Вучоныя-краязнаўцы: В. Грыцкевіч, М. Ермаловіч, У. Калеснік, І. Казакова, В. Ліцвінка, В. Ляшук, А. Мальдзіс, М. Казлоўскі, У. Содаль, А. Фядосік, С. Чыгрын, А. Каўка, Я. Запруднік, В. Кіпель і інш. Пытанні літаратурнага краязнаўства на старонках часопіса «Роднае слова». Штогадовае Свята беларускага пісьменства і друку ў гарадах Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 1.3. Крыніцы літаратурнага краяўзнаўства

Паняцці «краязнаўчы дакумент», «краязнаўчы фонд», «краязнаўчыя запатрабаванні», «інфармацыйныя краязнаўчыя рэсурсы». Краязнаўчыя каталогі і картатэкі. Асноўныя групы дакументаў, якія складаюць краязнаўчы фонд. Тэматычныя папкі аб жыцці і творчасці пісьменнікаў.

Крыніцы краязнаўства ў рабоце ўстаноў культуры. Археалагічныя крыніцы. Этнаграфічныя крыніцы. Палеаграфія. Тапаніміка. Нумізматыка. Геральдыка. Архіўныя, музейныя і бібліятэчныя матэрыялы ў краязнаўстве. Методыка пошуку.

Адметныя крыніцы літаратурнага краязнаўства. Асноўныя і дадатковыя крыніцы. Літаратурна-гістарычныя і літаратурна-мастацкія крыніцы. Роля мемуарнай літаратуры ў правядзенні краязнаўчых даследаванняў.

Старажытныя крыніцы краязнаўства: летапісы, хронікі, дзённікі, мемуары і інш. Успаміны, эсэ, літаратурна-крытычныя артыкулы, літаратурныя партрэты, літаратурна-публіцыстычныя творы. Зборнікі пісьменніцкіх аўтабіяграфій («Пяцьдзясят чатыры дарогі», «Пра час і пра сябе», «Вытокі песні» і інш.). Творы мастацкай літаратуры. Рукапісы асабістых архіваў пісьменніка. Рукапісы, дакументы, матэрыялы перапіскі архіўных і музейных фондаў. Вусныя аповеды, заснаваныя на літаратурных фактах: успаміны землякоў пра пісьменніка, аповеды пра падзеі і канкрэтныя аб’екты, адлюстраваныя ў літаратурных творах, пра рэальных асоб, што сталі прататыпамі літаратурных герояў.

Літаратурна-краязнаўчыя выданні: даведачныя («Гарады Беларусі», «Памяць», «Беларусь літаратурная», «Куфэрак Віленшчыны», «Ракаўскі шлях», «Нашчадкі: сучасная паэзія Валожыншчыны», «Дзвіна: Віцебшчына літаратурная» і інш.); манаграфічна-нарысавыя (У. Гніламёдаў «Іван Мележ: нарыс жыцця і творчасці», Р. Бярозкін «Аркадзь Куляшоў» і інш.); мастацка-дакументальныя творы (А. Мальдзіс «Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: нарысы быту і звычаяў», К. Тарасаў «Памяць пра легенды: постаці беларускай мінуўшчыны»; летапісы жыцця і творчасці беларускіх пісьменнікаў, звязаныя з гісторыяй краю (мясцовасці). Серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі», «Вядомы і невядомы».

Літаратурна-краязнаўчы матэрыял на старонках перыядычных выданняў: у часопісах «Полымя», «Маладосць», «Нёман», «Роднае слова», «Спадчына»; газетах «Літаратура і мастацтва», «Культура», «Звязда», «Літаратурная Беларусь», «Краязнаўчая газета».

Роля «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва», бібліяграфічнага даведніка «Беларускія пісьменнікі», рэгіянальных выданняў і сродкаў масавай інфармацыі ў пашырэнні і паглыбленні ведаў у галіне літаратурнага краязнаўства.

Рукапісныя, машынапісныя, аўдыязапісы, фота- і кінавідэаматэрыялы ў арганізацыі і ажыццяўленні літаратурна-краязнаўчай дзейнасці.

Літаратурнае краязнаўства і фальклор. Роля фальклору ў станаўленні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчай індывідуальнасці пісьменніка. Збіранне твораў народна-паэтычнай творчасці ў сваім краі, разгляд мясцін, апетых у народным эпасе, казках, песнях. Спецыфіка літаратурна-краязнаўчага даследавання фальклору: складанне апытальнікаў, аўдыязапіс твораў вуснай народнай творчасці, пашпартызацыя запісу, аналіз сабранага матэрыялу, выяўленне краязнаўчых элементаў, вядзенне дзённіка, даклад па выніках палявога даследавання.

## Раздзел 2.
## Актуальныя аспекты літаратурна-краязнаўчай дзейнасці

### Тэма 2.1. Віды і формы літаратурна-краязнаўчай дзейнасці

Асаблівасці зместу літаратурна-краязнаўчай дзейнасці ва ўстановах культуры.

Роля нацыянальнай літаратуры ў захаванні традыцыйных каштоўнасцей грамадства.

Віды літаратурна-краязнаўчай дзейнасці:

даследчая дзейнасць (даследаванне гісторыі ўзаемаадносін пісьменніка і края; даследаванне асаблівасцей края, зыходзячы з яго прадстаўленасці ў мастацкай літаратуры, у прасторавай і культурнай характарыстыках; даследаванне сучаснага літаратурнага працэсу ў краі;

арганізацыя культурна-адукацыйных мерапрыемстваў літаратурна-краязнаўчай тэматыкі;

развіццё літаратурнага турызму;

літаратурнае асветніцтва ў сацыяльнай практыцы і віруальнай прасторы.

Формы літаратурна-краязнаўчай работы:

азнаямленне з навуковай літаратурай па выбранай тэматыцы ў бібліятэцы, праз інтэрнэт-рэсурсы (манаграфічныя даследаванні, крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы, прысвечаныя аналізу жыцця і творчасці пісьменнікаў, звязаных з пэўнай мясцовасцю, мастацкія творы пісьменніка, эпісталярная спадчына пісьменніка, яго мемуары і дзённікі, інфармацыя пра прататыпы вобразаў яго твораў, варыянты і рэдакцыі яго твораў);

пошукавая дзейнасць у музеях, дзяржаўных архівах, асабістым архіве пісьменніка, сямейных архівах і інш. (перапіска, мемуары і дзённікі, інфармацыя пра прататыпы вобразаў яго твораў, сувязі з мясцовасцю, варыянты і рэдакцыі яго твораў, фотаздымкі, сувязі з іншымі творцамі);

наладжванне кантактаў з краязнаўцамі (мясцовыя краязнаўцы, кіраўнікі літаратурна-краязнаўчых гурткоў сваёй мясцовасці (рэгіёна), літаратурных суполак, знаёмства з сваякамі пісьменніка, знаёмымі, пісьменнікамі-землякамі);

аналіз праведзенай работы і на яго аснове выбар формы практычнай рэалізацыі мерапрыемства (мерапрыемстваў, комплексу мерапрыемстваў, плана, праграмы) літаратурна-краязнаўчай тэматыкі ў сваёй установе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(арганізацыі).

Метады літаратурна-краязнаўчага даследавання: інтэгратыўны, параўнальна-гістарычны, аналітыка-інтэрпрэтацыйны, гісторыка-літаратурны, сістэмна-функцыянальны.

## Тэма 2.2. Культурна-адукацыйны патэнцыял літаратурна-краязнаўчай дзейнасці

Асноўныя формы культурна-адукацыйных мерапрыемстваў літаратурна-краязнаўчай тэматыкі на сучасным этапе.

Літаратурна-краязнаўчы гурток. Віды літаратурна-краязнаўчых гурткоў: фальклорныя, гісторыка-літаратурныя, прысвечаныя пісьменніку-земляку або групе пісьменнікаў, гурткі змешанага тыпу. Планаванне, склад і змест працы.

Літаратурна-краязнаўчае аб’яднанне. Арганізацыя мерапрыемстваў з актыўным удзелам мясцовых краязнаўцаў, членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Літаратурная экскурсія. Тыпы экскурсій на літаратурныя тэмы (па мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю пісьменніка (пісьменнікаў); па літаратурных мясцінах рэгіёна; змешаныя экскурсіі. Спецыфіка і тыпы літаратурных аб’ектаў у літаратурных экскурсіях. Прыёмы асвятлення літаратуры пэўнага гістарычнага часу, узнаўленне яго характэрных рыс для раскрыцця літаратурнага перыяду або перыяду жыцця і творчасці мастака слова. Асвятленне ў экскурсіях літаратурна-краязнаўчага матэрыялу, вуснай народнай творчасці. Выкарыстанне літаратурных твораў для раскрыцця экскурсійнага аб’екта, прыём літаратурнага мантажу. Уключэнне ў экскурсію запісаў майстроў мастацкага слова, пісьменнікаў, тэатральнага дзейства (экскурсіі-спектаклі). Этапы падрыхтоўкі экскурсіі, іх паслядоўнасць.

Літаратурна-творчы вечар. Выбар тэмы і формы правядзення, вызначэнне ініцыятыўнай групы і размеркаванне індывідуальных заданняў. Віды літаратурна-краязнаўчых вечароў: вечар, прысвечаны пісьменніку-земляку, групе пісьменнікаў пэўнага рэгіёна, тэме роднага краю ў літаратуры і іншых відах мастацтва, юбілею пэўнага твора пісьменніка-земляка і інш.

Уключэнне кампанентаў літаратурнага краязнаўства ў мерапрыемствы па арганізацыі культурнага адпачынку (вольнага часу) насельніцтва. Баль. Літаратурны салон. Фестываль. Сувязь мерапрыемстваў з літаратурна-краязнаўчай тэмытыкай.

Развіццё літаратурнага турызму. Краязнаўчы турызм. Гісторыя развіцця турысцка-краязнаўчых маршрутаў. Асноўныя турысцка-краязнаўчыя маршруты Рэспублікі Беларусь: унутрыраённыя, міжраённыя, унутрыабласныя, міжрэгіянальныя. Віды краязнаўчага турызму ў Рэспубліцы Беларусь па абласцях. Асаблівасці складання турысцка-краязнаўчых маршрутаў. Комплекснае выкарыстанне турысцкага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Віртуалізацыя культурна-адукацыйнай прасторы (літаратурныя інтэрнэт-сайты, віртуальныя літаратурныя клубы, віртуальныя экскурсіі, віртуальныя літаратурныя карты і ландшафты).

## Тэма 2.3. Рэгіянальнае літаратурнае краязнаўства

Беларусь у еўрапейскай і сусветнай супольнасці.

Адміністрацыйны падзел Рэспублікі Беларусь. Асаблівасці адміністрацыйнага раяніравання. Вобласці, раённыя цэнтры.

Гісторыка-культурныя рэгіёны Беларусі (Цэнтральная Беларусь, Паазер'е, Падняпроўе, Палессе, Панямонне). Паняцце пра край.

Рэгіянальны прынцып вывучэння літаратуры.

Літаратурныя і культурныя традыцыі краю.

Адметнасць вуснай народнай творчасці краю. Легенды, паданні, казкі, запісаныя на тэрыторыі краю і адлюстраванне ў іх гісторыі з'яўлення назваў рэк, азёр і населеных пунктаў.

Назвы паселішчаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю беларускіх пісьменнікаў.

Рамёствы.

Адметнасць мовы рэгіёна і яе выкарыстанне ў творах пісьменнікаў-землякоў.

Родны край у літаратурных помніках старажытнасці. Беларускія летапісы пра падзеі і дзеячаў вобласці, раёна, горада, іншага населенага пункта.

Літаратура эпохі Адраджэння і родны край.

Рэгіянальная літаратура ў складзе Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Мясцовыя друкарні. Пісьменнікі-землякі. Творы беларускіх пісьменнікаў на беларускай і польскай мовах. Адметнасць рэгіянальнай літаратуры ў пач. XX ст. Пісьменнікі-землякі ў час Вялікай Айчыннай вайны, іх творы аб родным краі. Рэгіянальная літаратура ў пасляваенны перыяд.

Рэгіянальная літаратура на сучасным этапе. Стварэнне ў абласных і раённых цэнтрах літаратурных аб'яднанняў і аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Выданне альманахаў. Рэгіянальная літаратура ў мясцовым друку. Беларускамоўныя і рускамоўныя пісьменнікі-землякі.

Родныя мясціны як крыніца натхнення для пісьменніка. Родны край (прырода, помнікі, мова, людзі) у творах мастацкай літаратуры. Прататыпы літаратурных герояў. Родныя, блізкія і знаёмыя пісьменнікаў-землякоў. Іх радаводы.

Ушанаванне памяці знакамітых пісьменнікаў: помнікі, сядзібы-музеі, кватэры-музеі, хаты-музеі, назвы паселішчаў, заказнікаў, паркаў, вуліц, наданне імя пісьменніка культурна-асветным установам, установам адукацыі і г.д.

Знакавыя літаратурныя мясціны рэгіёнаў (абласцей), іх сувязь з жыццёвым і творчым шляхам пісьменнікаў, напісаннем мастацкіх твораў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіццём літаратурнага працэсу: Брэстчына (Л. Зізаній, А. Філіповіч, В. Дунін-Марцінкевіч, Я. Колас, Ф. Дастаеўскі, А. Міцкевіч і інш.), Віцебшчына (І. Бунін, А. Пушкін, У. Маякоўскі, К. Вераніцын, Я. Купала, У. Караткевіч, В. Быкаў, П. Броўка і інш.), Гомельшчына (І. Шамякін, І. Мележ і інш.), Гродзеншчына (Э. Ажэшка, М. Багдановіч, М. Гогаль, Ф. Багушэвіч, А. Міцкевіч, С. Будны, Я. Брыль, Я. Чачот і інш.), Магілёўшчына («Магілёўская хроніка», «Баркулабаўскі летапіс», М. Гарэцкі, А. Куляшоў, В. Дунін-Марцінкевіч і інш.), Міншчына (К. Буйло, М. Танк, Я. Купала, Я. Колас, К. Крапіва, П. Трус, К. Чорны і інш.).

Турыстычныя рэгіёны Рэспублікі Беларусь. Выкарыстанне турысцкага патэнцыялу пры арганізацыі літаратурна-краязнаўчай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ САМАСТОЙНАГА ВЫВУЧЭННЯ

# Раздзел 1.
# Агульныя пытанні гісторыі і метадалогіі літаратурнага краязнаўства

### Тэма 1.1. Літаратурнае краязнаўства як навука

***Пытанні***

1. Функцыі краязнаўчай дзейнасці ўстаноў культуры.
2. Краязнаўства і арганізацыя культурнага адпачынку (вольнага часу) насельніцтва.
3. Метады краязнаўчых даследаванняў.

***Спіс рэкамендаванай літаратуры***


1. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры: Кодекс Республики Беларусь, 20 июля 2016 г., № 413-З // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь, 2016. – 2/2412. – Гл. 25.
2. Краеведение : учебно-методический комплекс [Электронный ресурс] / Составитель : С.О. Шидловский. – Новополоцк : ПГУ, 2011. – Режим доступа : https://www.psu.by/images/stories/spf/kaf-turizm/umk-kraevedenie.pdf. – Дата доступа : 07.12.2016. – С. 4–7.
3. Строганов, М.В. Литературное краеведение : учеб. пособие / М.В. Строганов. – Тверь : ТвГУ, 2009. – С. 7–41.


### Тэма 1.2. Гісторыя станаўлення і развіцця літаратурнага краязнаўства

***Пытанні***

1. Роля газеты «Наша ніва» ў развіцці краязнаўства.
2. Асаблівасці беларускага краязнаўчага руху ў 1920-я гг.

***Спіс рэкамендаванай літаратуры***


1. Ваганова, А.Н. Историческое краеведение Беларуси : учеб. пособие / А.Н. Ваганова [и др.]. – Минск : Изд-во БГУ, 1980. – С. 18–24.
2. Каспяровіч, М. Краязнаўства / М. Каспяровіч. – Мінск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1929. – С. 47–58, 68–86.
3. Краеведение : учебно-методический комплекс [Электронный ресурс] / Составитель : С.О. Шидловский. – Новополоцк : ПГУ, 2011. – Режим доступа : https://www.psu.by/images/stories/spf/kaf-turizm/umk-kraevedenie.pdf. – Дата доступа : 07.12.2016. – С. 18–23.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 1.3. Крыніцы літаратурнага краязнаўства

*Пытанні*

1. Пісьмовыя крыніцы.
2. Інфармацыйныя краязнаўчыя рэсурсы.
3. Выкарыстанне краязнаўчых каталогаў, картатэк, даных электронных каталогаў.
4. Методыка краязнаўчага пошуку ў музеях і архівах.

*Спіс рэкамендаванай літаратуры*

1. Краеведение : учебно-методический комплекс [Электронный ресурс] / Составитель : С.О. Шидловский. – Новополоцк : ПГУ, 2011. – Режим доступа : https://www.psu.by/images/stories/spf/kaf-turizm/umk-kraevedenie.pdf. – Дата доступа : 07.12.2016. – С. 28–32, 100–104.
2. Краеведческая деятельность муниципальных публичных библиотек : метод. рекомендации / сост. Т.П. Медведева. – Красноярск : ГУНБ Краснояр. края, 2012. – С. 6–19.
3. Милонов, Н.А. Литературное краеведение / Н.А. Милонов. – М. : Просвещение, 1985. – С. 52–146.
4. Тэксталогія і яе дапаможныя навукі : вуч.-метад. дапаможнік / В.П. Рагойша [і інш.] ; пад рэд. В.П. Рагойшы. – Мінск : БДУ, 2015. – С. 128–133, 139–144, 177–179.

## Раздзел 2. Актуальныя аспекты літаратурна-краязнаўчай дзейнасці

### Тема 2.1. Змест, віды і формы літаратурна-краязнаўчай дзейнасці

*Пытанні*

1. Роля нацыянальнай літаратуры ў захаванні традыцыйных каштоўнасцей грамадства.
2. Метады літаратурна-краязнаўчага даследавання.

*Спіс рэкамендаванай літаратуры*

1. Краеведение : учебно-методический комплекс [Электронный ресурс] / Составитель : С.О. Шидловский. – Новополоцк : ПГУ, 2011. – Режим доступа : https://www.psu.by/images/stories/spf/kaf-turizm/umk-kraevedenie.pdf. – Дата доступа : 07.12.2016. – С. 122–127.
2. Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці: Трансфармацыя традыцыйных каштоўнасцей у інфармацыйным грамадстве : матэрыялы V Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 28 верасня 2016 г.) / уклад.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І.Б. Лапцёнак, І.Р. Голубева, А.А. Галкін ; рэдкал.: І.Б. Лапцёнак (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2016. – С. 48–53, 76–83, 279–284.

3. Милонов, Н.А. Литературное краеведение / Н.А. Милонов. – М. : Просвещение, 1985. – С. 31–50.

4. Тэксталогія і яе дапаможныя навукі : вуч.-метад. дапаможнік / В.П. Рагойша [і інш.] ; пад рэд. В.П. Рагойшы. – Мінск : БДУ, 2015. – С. 173–174.

## Тэма 2.2. Культурна-адукацыйны патэнцыял літаратурна-краязнаўчай дзейнасці

### *Пытанні*

1. Кірункі работы літаратурна-краязнаўчага гуртка.
2. Узнаўленне гістарычных форм арганізацыі культурнага адпачынку (вольнага часу) насельніцтва на аснове актульных аспектаў літаратурнага краязнаўства.

### *Спіс рэкамендаванай літаратуры*

1. Аксюцік, М.І., Каралькова, Л.В. Сацыяльна-культурная дзейнасць : гісторыка-тэарэтычныя ўводзіны : вуч. дапаможнік / М.І. Аксюцік, Л.В. Каралькова. – Віцебск : Выд-ва УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2004. – С. 6–46.
2. Аронсон, М. Литературные кружки и салоны / М. Аронсон, С. Рейсер. – Спб. : Гуманитар. агенство «Акад. проект», 2001. – С. 19–82.
3. Лозка, А.Ю. Беларуская фальклорыстыка: Народныя гульні: вуч.-метад. дапам. / А.Ю. Лозка, А.В. Дрыгін. – Мінск : БДПУ, 2012. – С. 3–25.
4. Тэксталогія і яе дапаможныя навукі : вуч.-метад. дапаможнік / В.П. Рагойша [і інш.] ; пад рэд. В.П. Рагойшы. – Мінск : БДУ, 2015. – С. 170–171.

## Тема 2.3. Рэгіянальнае літаратурнае краязнаўства

### *Пытанні*

1. Тэорыя «культурных гнёзд» у гісторыі літаратурнага краязнаўства.
2. Гісторыка-культурныя ландшафты Беларусі.
3. Выкарыстанне патэнцыялу турыстычных рэгёнаў Рэспублікі Беларусь у дзейнасці ўстаноў культуры па арганізацыі культурнага адпачынку (вольнага часу) насельніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Спіс рэкамендаванай літаратуры*


1. Краеведение : учебно-методический комплекс [Электронный ресурс] / Составитель : С.О. Шидловский. – Новополоцк : ПГУ, 2011. – Режим доступа : https://www.psu.by/images/stories/spf/kaf-turizm/umk-kraevedenie.pdf. – Дата доступа : 07.12.2016. – С. 122–127.
2. Локотко, А.И. Историко-культурные ландшафты Беларуси / А.И. Локотко. – Минск : Бел. наука, 2006. – С. 5–21, 45–48, 129–132, 172–176, 209–214, 261–264, 403–428.
3. Милонов, Н.А. Литературное краеведение / Н.А. Милонов. – М. : Просвещение, 1985. – С. 24–35.
4. Туристские регионы Беларуси / З.Я. Андриевская [и др.] ; под общ. ред. И.И Пирожника; составитель Л.В. Ловчая. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2008. – С. 19–30, 33–40, 107–114, 207–214, 269–277, 353–363, 385–392, 487–494.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

### *Асноўная*

1. Аксюцік, М.І., Каралькова, Л.В. Сацыяльна-культурная дзейнасць : гісторыка-тэарэтычныя ўводзіны : вуч. дапаможнік / М.І. Аксюцік, Л.В. Каралькова. – Віцебск : Выд-ва УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2004. – С. 6–46.

2. Ваганова, А.Н. Историческое краеведение Беларуси : учеб. пособие / А.Н. Ваганова [и др.]. – Минск : изд-во БГУ, 1980. – 264 с.

3. Карлюкевіч, А. Краязнаўчы рэсурс у вывучэнні беларускай літаратуры / А. Карлюкевіч; прадмова А. Мальдіса. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2015. – 295 с.

4. Краеведение : учебно-методический комплекс [Электронный ресурс] / Составитель : С.О. Шидловский. – Новополоцк : ПГУ, 2011. – Режим доступа : https://www.psu.by/images/stories/spf/kaf-turizm/umk-kraevedenie.pdf. – Дата доступа : 07.12.2016. – С. 4–7, 18–23, 28–32, 100–104, 122–127.

5. Локотко, А.И. Историко-культурные ландшафты Беларуси / А.И. Локотко. – Минск : Бел. наука, 2006. – С. 5–21, 45–48, 129–132, 172–176, 209–214, 261–264, 403–428.

6. Милонов, Н.А. Литературное краеведение / Н.А. Милонов. – М. : Просвещение, 1985. – С. 24–50, 52–146.

7. Строганов, М.В. Литературное краеведение : учеб. пособие / М.В. Строганов. – Тверь, ТвГУ, 2009. – С. 7–41.

8. Туристские регионы Беларуси / З.Я. Андриевская [и др.] ; под общ. ред. И.И Пирожника; составитель Л.В. Ловчая. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2008. – С. 19–30, 33–40, 107–114, 207–214, 269–277, 353–363, 385–392, 487–494.

### *Дадатковая*

1. Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Беларуси XVI – 30-е годы

1. XX в. / Л.В. Алексеев. – Минск : Беларус. навука, 1996. – 205 с.

2. Аронсон, М. Литературные кружки и салоны / М. Аронсон, С. Рейсер. – Спб. : Гуманитар. агенство «Акад. проект», 2001. – С. 19–82.

3. Беларускія пісьменнікі : бібліягр. слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А.В. Мальдзіса. – Мінск : БелЭн, 1992–1995.

4. Ваганова, А.Н. Историческое краеведение Беларуси : учеб. пособие / А.Н. Ваганова [и др.]. – Минск : изд-во БГУ, 1980. – С. 18–24.

5. Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Літаратурнае краязнаўства» [Электронны рэсурс] / Складальнік : А.І. Лугоўскі. – Рэжым доступу : http://elib.bspu.by/handle/doc/2535. – Дата доступу : 07.12.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Каспяровіч, М. Краязнаўства / М. Каспяровіч. – Мінск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1929. – С. 47–58, 68–86.
7. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 118 с.
8. Князева, В.М. Падарожжа па Беларусі: Гарады і гарадскія пасёлкі : даведач. выд. / В.М. Князева. – Мінск : Беларусь, 2005. – 303 с.
9. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронный ресурс]: Кодекс Республики Беларусь от 20 июля 2016 г. № 413-З // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь, 02.08.2016, 2/2412. – Гл. 25.
10. Краеведческая деятельность муниципальных публичных библиотек : метод. рекомендации / сост. Т.П. Медведева. – Красноярск : ГУНБ Краснояр. края, 2012. – С. 6–19.
11. Кулажанка, Л. Літаратурныя мясціны Беларусі : краязнаўчы даведнік : у 3 кн. / Л. Кулажанка, А. Мальдзіс, С. Сачанка ; рэд. А. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2000. – Кн. 1 : Брэсцкая, Віцебская і Гомельская вобласці. – 2000. – 286 с.
12. Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці: Трансфармацыя традыцыйных каштоўнасцей у інфармацыйным грамадстве : матэрыялы V Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 28 верасня 2016 г.) / уклад. І.Б. Лапцёнак, І.Р. Голубева, А.А. Галкін ; рэдкал.: І.Б. Лапцёнак (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2016. – С. 48–53, 76–83, 279–284.
13. Лозка, А.Ю. Беларуская фальклярыстыка: Народныя гульні: вуч.-метад. дапам. / А.Ю. Лозка, А.В. Дрыгін. – Мінск : БДПУ, 2012. – С. 3–25.
14. Лярский, П.А. Пособие по краеведению / П.А. Лярский. – Минск : Вышэйш. школа, 1966. – 239 с.
15. Ляшук, В.Я. Літаратурнае краязнаўства ў школе / В.Я. Ляшук. – Мінск : Вышэйш. школа, 1991. – 150 с.
16. Максаковский, В.П. Литературная география: географические образы в русской художественной литературе: книга для учителя / В.П. Максаковский. – М.: Просвещение, 2006. – 405 с.
17. Мысліцелі і асветнікі Беларусі, X – XIX стагоддзі : энцыкл. даведнік. – Мінск : БелЭн, 1995. – 670 с.
18. Рэспубліка Беларусь: вобласці і раёны: энцыкл. даведнік / аўт.-скл. Л.В. Календа. – Мінск : Беларус. энцыкл, 2004. – 566 с.
19. Тэксталогія і яе дапаможныя навукі : вуч.-метад. дапаможнік / В.П. Рагойша [і інш.] ; пад рэд. В.П. Рагойшы. – Мінск : БДУ, 2015. – С. 128–133, 139–144, 165–179, 170–171, 173–174, 177–179.
20. Флиер, А.Я. Культурная среда и ее социальные черты [Электронный ресурс] / А.Я. Флиер // Информационный гуманитарный портал «Знание. Понимание. Умение». – Режим доступа : http://www.zpu-journal.ru/e-zpu/2013/2/Flier_Cultural-Milieu/. – Дата доступа : 07.12.2016.
21. Художественная литература как средство формирования правосознания и источник знаний о специфике правосознания определенной эпохи [Электронный ресурс]. – Режим доступа : //

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

http://www.jourclub.ru/36/1325/4/. – Дата доступа : 07.12.2016.
22. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1984–1987.
23. Янко, М.Д. Литературное краеведение в школе / М.Д. Янко. – М. : Просвещение, 1965. – 192 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ